***К. В. Лёгенькая***

*Навуковы кіраўнік*
***А. А. Станкевіч***

*Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт*
*імя Ф. Скарыны*
*Рэспубліка Беларусь*

# УСТОЙЛІВЫЯ АБРАМЛЯЛЬНЫЯ ФОРМУЛЫ БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ КАЗКІ

Гістарычны шлях, які прайшло чалавецтва ад старажытнасці да сённяшніх дзён, складаны і супярэчлівы. На ім часта сустракаліся прагрэсіўныя і рэгрэсіўныя з’явы, імкненне да новага і адданасць традыцыям, жаданне перамен і ідэалізацыя мінулага. Аднак ва ўсіх сітуацыях немалаважную ролю адыгрывала культура, якая дапамагала чалавеку адаптавацца ў зменлівых умовах. У ёй, нібы ў люстэрку, выражаліся асноўныя погляды і памкненні народа, яго своеасаблівы ідэйна-эстэтычны і этычны кодэкс. Яскравым прыкладам гэтага можна лічыць казку, дзе заўсёды праяўляюцца рысы людзей, якія яе стварылі, іх незгасальная вера ў перамогу дабра над злом, у лепшую і шчаслівую будучыню, у справядлівасць.

Мастацкая вобразнасць і арыгінальнасць казкі ствараецца ў выніку сінтэзу ўсіх паэтычных і кампазіцыйных сродкаў: эпітэтаў, параўнянняў, гіпербал, паўтораў, зачынаў, канцовак і г. д. Спецыфіка гэтых сродкаў у тым, што яны з’яўляюцца агульнымі для многіх твораў. Менавіта таму іх называюць устойлівымі формуламі.

З боку кампазіцыі звычайна выдзяляюць абрамляльныя формулы і медыяльныя (Н. Вядзернікава). Абрамляльныя можна падзяліць на ініцыяльныя (прыказкі, зачыны) і фінальныя (канцоўкі, канцавыя прыказкі) шаблоны.

Ініцыяльныя формулы маюць вельмі важную функцыю – зацікавіць слухача, увесці яго ў незвычайны, ірэальны свет казкі. Вылучаюць прыказкі-прыгаворкі, якія не звязаны з сюжэтам казкі, выконваюць толькі забаўляльную функцыю і маюць разгорнуты выгляд.

Больш лаканічным з’яўляецца зачын казак, яго задача даць слухачу пэўную інфармацыю аб далейшым змесце казкі. «У некатарым царстве, у некатарым гасударстве жыў-быў цар» – звычайны зачын, які паказвае на месца дзеяння («некатарае царства»), час («жыў-быў»). Выкарыстаныя ў апошняй формуле дзеясловы існавання «жыць» і «быць» абазначаюць даўно мінулае дзеянне, таму можна гаварыць аб умоўнасці і нават нерэальнасці факта дзеяння. Гэту думку пацвярджае і формула «ў некатарым царстве», што паказвае на невядомасць, недакладнасць месца падзей.

З вышэйсказанага бачна, што зачын мае тэмпаральную і лакальную функцыі, такім чынам утвараючы казачны хранатоп.

Да абрамляльных казачных формул, акрамя ініцыяльных, адносяцца фінальныя звароты. Яны ў сваю чаргу ўключаюць у сябе формулы канцовак і канцавых прыказак. Калі галоўная функцыя зачынаў псіхалагічна настроіць слухача, увесці ў фантастычны свет казкі, то функцыя канцовак процілеглая – вярнуць яго з чарадзейнага свету да рэальнасці.

Як і зачын, канцоўка мае непасрэднае дачыненне да асноўнага зместу казкі. Ідучы пасля кульмінацыйнага моманту, яна паведамляе пра добрае завяршэнне фантастычных падзей, перамогу ўсемагутнага дабра, справядлівасці. Традыцыйная формула канцоўкі мае наступны выгляд: «І сталі яны жыць і пажываць і дабра нажываць». Ключавымі словамі тут з’яўляюцца аднакаранёвыя дзеясловы існавання «жыць», «пажываць» і «нажываць». Нагадаем, што дзеяслоў «жыць» выкарыстоўваецца і ў зачынах, толькі там ён ужываецца ў форме прошлага часу і паказвае на ўмоўнасць, недакладнасць факта дзеяння. У канцоўцы ж выкарыстоўваецца неазначальная форма дзеяслова – інфінітыў, які ўвогуле не здольны выконваць тэмпаральную функцыю. Аднак дае падставу разважаць аб праўдзівасці падзей канцоўка наступнага тыпу: «…памірыліся яны і цяпер, мусіць, ладна жывуць». У дадзеным выпадку сэнсавы акцэнт прыпадае не на дзеяслоў цяперашняга часу «жывуць», а на мадальнае слова «мусіць», якому характэрна значэнне магчымасці, меркавання, дапушчэння.

Канцоўка можа мець наступны выгляд: «І я на тым вяселлі быў, мёд, віно піў, па барадзе цякло, а ў роце не было. Далі мне там смаляную кабылку, лазовае сядло, гарохавую пугу. Еду я назад на кабылцы, бачу – гумно гарыць. Я спыніў кабылку, пачаў яго тушыць. Пакуль тушыў – кабылка мая ад агню растала, сядло козы з’елі, а пугу вароны раздзяўбалі… Адтуль я далей

пехатою пайшоў, да вас прыйшоў і гэтую казку расказаў». Адсюль бачым, што канцавая прыгаворка служыць толькі для пацверджання міфічнасці, выдуманасці казачных падзей, для стварэння ўзнёсласці аповеду і эмацыянальнай разрадкі слухачоў.

Такім чынам, устойлівыя абрамляльныя формулы казкі значна ўзбагачаюць фантастычны аповед, робяць яго непадобным да іншых фальклорных жанраў. Разам з тым, яны дапамагаюць выяўленню характэрных рыс беларускай культуры, якія ў алегарычнай зашыфроўцы леглі ў аснову твора.

**_А. А. Максименко_**
*Научный руководитель*
**_П. М. Батура_**
*Белорусский торгово-экономический*
*университет потребительской кооперации*
*г. Гомель, Республика Беларусь*

## УГО ЧАВЕС И ЕГО ВКЛАД В ФОРМИРОВАНИЕ НОВОЙ МОДЕЛИ МИРОУСТРОЙСТВА

Распад СССР превратил биполярный мир в однополярный, где США становятся «международным жандармом» и стремятся «делать погоду» на планете. Под предлогом установления демократии именно США при поддержке НАТО организовали вооруженные акции по уничтожению политических режимов в Ливии, Ираке, Афганистане, замахиваются на Иран, а революции «арабской весны» дестабилизировали обстановку в этом регионе (к примеру, Египет). В результате льется кровь, но не видно демократии в этих странах. Цель «борьбы за демократию» – полезные ископаемые этих государств (нефть, газ и др.). Но не все великие державы с таким положением согласны (Россия, Китай, Индия, Беларусь и многие другие). Особое место в этой когорте занимает Боливарианская Республика Венесуэла в лице ее Президента Уго Чавеса.

Родился Уго Рафаэль Чавес Фриас 28 июля 1954 г. в многодетной семье. Сложной и противоречивой была его биография. Следует отметить, что еще до своего президентства Чавес уже сформировался как бесспорный лидер, выделявшийся широтой общественно-политического кругозора и эрудицией. Природа наделила его организаторскими способностями, умением убеждать людей в своей правоте. Он получил прекрасное военное и гражданское образование. Встав во главе государства в 1988 г. и сформировав дееспособную правительственную команду, Чавес стал претворять в жизнь давно вынашиваемые планы.

В 1999 г. была принята новая Конституция, в которой объявлялось равенство всех форм собственности. Оно должно гарантировать реальное существование смешанной экономики и действительно свободной конкуренции. По Конституции все стратегические отрасли и ресурсы экономики, а также сфера образования и здравоохранения принадлежат государству. Приоритетной объявлена защита наименее защищенных слоев населения: детей, молодежи, пенсионеров, инвалидов. Венесуэла, как известно, занимает одно из ведущих мест в мире по запасам и добыче нефти. Чавес изгнал американцев из нефтяной промышленности, а потом и войска.

Осуществив кардинальные изменения во внутренней политике, Уго Чавес активизировал и внешнеполитическую деятельность, отстаивая многополярный мир и переустройство мирового порядка на справедливой, равноправной основе на базе «сбалансированной взаимозависимости». Несмотря на «левую риторику» Чавес был далек от экспериментов в стиле Ленина, Сталина или Пола Пота. Он бросил вызов США невзирая на их неоднократные попытки свергнуть политический режим Венесуэлы и самого президента. Он наладил всестороннее сотрудничество с Кубой, поставляя ей даже избыточное количество нефти и получая взамен квалифицированных врачей и учителей.

Приоритетным для Венесуэлы остается упрочение связей со странами Организации стран-экспортеров нефти (ОПЕК), равно как и с теми, кто не входит в эту организацию, прежде всего с Россией, Мексикой, Норвегией. Что касается отношений с Россией, то благодаря закупкам российского вооружения Чавес получил возможность обойти американское эмбарго на поставки оружия. Заслуживает внимания сформулированная Чавесом идея образования Конфедерации государств Латинской Америки. Тем самым он пытался воплотить в жизнь мечту Боливара об объединении латиноамериканских государств. Он продвигал идею создания в Латинской Америке военно-политического союза в рамках так называемой «оси добра» в противовес американской